Сталіца

ЖЫЦЦЁ ВАРТАЕ ТАГО, КАБ ПРАЖЫВАЦЬ ЯГО З РАДАСЦЮ

Калі ўзнікаюць цяжкасці, дапамогу можна знайсці



Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна горада Мінска адкрыты з 1999 года. У сферы яго ўвагі другі па велічыні сталічны раён з насельніцтвам каля 310 тысяч чалавек. Падапечныя цэнтра — тыя, хто аказаўся ў складанай жыццёвай сітуацыі, а таксама пенсіянеры, шматдзетныя, адзінокія пажылыя грамадзяне, тыя, хто адасоблена пражывае, інваліды, асобы з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў ад 18 да 23 гадоў, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, асобы, якія пацярпелі ад наступстваў войнаў. Тут функцыянуе восем аддзяленняў, сектар па рабоце з недзеяздольнымі грамадзянамі і праект, у рамках якога аказваецца бясплатная прававая дапамога сацыяльна неабароненым грамадзянам.

— Каля 40 тысяч чалавек — гэта тыя, хто да нас звярнуўся па дапамогу, атрымаў яе, з кім мы застаёмся на сувязі і тыя, пра каго мы даведаліся, што яны маюць патрэбу ў дапамозе, — расказала «Звяздзе» **дырэктар ТЦСАН Маскоўскага раёна Мінска Наталля ЖАРЫКАВА.** — Даведваемся пра такіх ад іх сваякоў, суседзяў, супрацоўнікаў міліцыі, паліклінікі, разлікова-даведачнага цэнтра, пошты. У нас ёсць алгарытм узаемадзеяння з пэўнымі суб'ектамі прафілактыкі, якія па абстаноўцы ў кватэры, стане чалавека, ступені яго мабільнасці, наяўнасці ў яго сацыяльных сувязяў бачаць, што ён мае патрэбу ў сацыяльнай абароне. Мы збіраем інфармацыю і глядзім, якую дапамогу можам аказаць гэтаму чалавеку або сям'і, зыходзячы з яго даходу, фізічнага, маральнага стану.

Часта размова ідзе пра комплексную дапамогу: акрамя матэрыяльнай, чалавек мае патрэбу ў паслугах сацыяльнага работніка, сядзелкі, нянькі. Садзейнічаем у афармленні дакументаў для размяшчэння ў дамы-інтэрнаты.

Бясплатна аказваем сацыяльную дапамогу дома адзінокім пажылым грамадзянам, у тым ліку сямейным парам, інвалідам I і II груп, якія не маюць працаздольных членаў сям'і, абавязаных іх утрымліваць, калі памер іх пенсіі не вышэй бюджэту пражытачнага мінімуму. Калі вышэй, то аплата можа быць частковай або поўнай. Нашы паслугі недарагія, напрыклад, амаль двухгадзінны візіт сацыяльнага работніка каштуе на сёння адзін рубель 38 капеек. Ёсць пералік дадатковых сацыяльных паслуг, там кошт іншы, але такіх менш. У пералік абавязковых уваходзіць 75 паслуг, дадатковых — 30. Сярод апошніх — прыгатаванне складаных страў, клопат аб хатніх жывёлах, мыццё плафонаў, прыбіранне ў шафах, дробны рамонт адзення.

Забяспечваем тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі, а калі чалавек набыў такія сродкі самастойна — кампенсуем іх кошт. Для інвалідаў I групы кампенсуем кошт падгузкаў.

Займаемся прызначэннем і распараджэннем сямейнага капіталу для шматдзетных сем'яў, выдаём ім пасведчанні, інфармуем пра льготы. Дапамагаем аформіць матэрыяльную дапамогу. Курыруем недзеяздольных паўналетніх людзей, якія пражываюць самастойна. У нас такіх каля 500 чалавек. Прызначаем ім апекуноў, каб падтрымліваць узровень іх жыцця.

— У якіх выпадках чалавек, які мае патрэбу ў дапамозе, можа застацца без клопату тэрытарыяльнага цэнтра?

— Калі сам свядома адмаўляецца. Ён мае на гэта права. Нехта прызвычаіўся да свайго ладу жыцця, жыве ў сваёй кватэры, не хоча нікуды пераязджаць і нікога да сябе пускаць. Нават, калі не можа перасоўвацца. Прадукты прыносяць суседзі, і гэтага чалавеку дастаткова. Тым не менш, мы настойліва рэкамендуем скарыстацца магчымасцямі, якія маюцца ў нашай дзяржаве. Тлумачым, інфармуем, што сацыяльны работнік паклапоціцца, каб падапечны быў накормлены, апрануты, каб яго кватэра была чыстай, каб, нарэшце, мог пагутарыць.

У нас ёсць аддзяленне, задача якога падтрымліваць сацыяльныя стасункі, мабільнасць і актыўнасць пажылых людзей. Навучаем карыстацца смартфонам, камп'ютарам, інтэрнэтам, заказваць тавары з дастаўкай. Навучаем гэтаму і дома. Пенсіянеры прыходзяць у наша аддзяленне, каб патанцаваць, паспяваць, паразмаўляць адно з адным. У нас такіх каля 200 чалавек. Ёсць гурткі платныя і бясплатныя.

Працуем з людзьмі, якія маюць асаблівасці па зроку і слыху. У штаце ёсць тры перакладчыкі жэставай мовы, ладзім з імі выязныя мерапрыемствы, канцэрты.

Маем два філіялы аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў. У адным навучаем падапечных (як правіла, гэта выпускнікі цэнтраў карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі) навыкам пярвічнага самаабслугоўвання, гатавання, шыцця, а таксама рабоце ў майстэрнях. У другім забяспечваем догляд інвалідаў, каб на некалькі гадзін разгрузіць іх бацькоў або законных прадстаўнікоў.

Два гады таму адкрылі яшчэ адно аддзяленне, і яно пакуль адзінае ў Мінску — так званыя трэніровачныя кватэры для набыцця навыкаў аўтаномнага пражывання маладымі інвалідамі. Яно было адкрыта пры падтрымцы раённай структуры Мінскай гарадской арганізацыі Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам (БелАДДІМІ) і Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама. Разлічана на адначасовае знаходжанне васьмі чалавек. Курс навучання — тры месяцы. Задача — пазбегнуць патрэбы змяшчаць гэтых маладых людзей у інтэрнат. Яны навучаюцца арыентавацца ў горадзе, распараджацца фінансамі, абараняць сябе ад гвалту. Каб уключыць у гэты працэс іх родных, стварылі бацькоўскі клуб.

Цяпер вядзём работу па адкрыцці аддзялення для людзей з дэменцыяй. Пакуль даглядаем такіх дома. Плануем таксама разам з нямецкімі партнёрамі рэалізаваць сумесны праект па навучанні догляду ляжачых хворых. Яшчэ адзін праект, які ў распрацоўцы, — інклюзіўны спорт. Размова пра вулічныя трэнажоры для інвалідаў. У планах на гэты год — вывесці на новы ўзровень індывідуальную работу з інвалідамі менавіта ў сферы спартыўных заняткаў. Збіраемся адкрыць спартзалу. Гэта вельмі перспектыўны кірунак.

Увогуле наш цэнтр аказвае масу паслуг самага шырокага спектра. Сярод новых — паслугі нянькі для дзяцей з трох да шасці гадоў у шматдзетных сем'ях, а таксама для дзяцей-інвалідаў да дасягнення імі 18 гадоў. Працуем з людзьмі, якія аказаліся ахвярамі гвалту, з асобамі з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў ад 18 да 23 гадоў. На базе нашага цэнтра працуюць групы ананімных алкаголікаў, ананімных наркаманаў. Супрацоўнічаем з Праваслаўнай царквой, Фондам ААН у сферы народанасельніцтва, разам грамадскімі арганізацыямі рэалізуем міжнародныя гуманітарныя праекты.

— Колькі людзей працуе ў цэнтры?

— Каля 200 чалавек. Большасць з іх аказвае непасрэдную сацыяльную дапамогу.

— Што павінен ведаць пра тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання любы чалавек?

— Кожны, хто аказаўся ў сітуацыі, у якой не ведае што рабіць, незалежна ад узросту, стану здароўя, сямейнага альбо сацыяльнага статусу, можа звярнуцца да нас. Самае меншае — мы накіруем па адрасе, дзе змогуць дапамагчы, калі гэта не ў нашых сілах. Але многія праблемы — ад матэрыяльных да псіхалагічных — мы дапамагаем вырашаць. Пажылым людзям не варта саромецца страты тых або іншых фізічных магчымасцяў, не трэба замыкацца. Жыццё вартае таго, каб пражываць яго з радасцю. Часам дастаткова бывае добрага слова, якое вы заўсёды пачуеце ў тэрытарыяльным цэнтры.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Нясумны занятак

САД З МЯДОВЫМ ПАХАМ

У Расцянскім доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў Чавускага раёна ствараюць творы мастацтва і развіваюць пчалярства

Напрыканцы мінулага года ў Прэзідэнцкай бібліятэцы Дома ўрада і Рэзідэнцыі Прэзідэнта была арганізаваная незвычайная выстава. На сценах яе з'явіліся творы зусім не славутых аўтараў, а выхаванцаў Расцянскага дома-інтэрната. І краналі яны не менш, чым работы вядомых майстроў. Выстава, дарэчы, так і называлася — «Мы дорым святло сваёй душы».

— Не паверыце, але некаторыя людзі нават адчувалі фізічнае ўздзеянне гэтых работ, — расказвае **дырэктар установы Алена СЯМЁНАВА.** — Наш Аляксандр Лебедзеў выпальвае па дрэве. У яго задумка — зрабіць калекцыю работ усіх храмаў Магілёўскай епархіі. Пакуль у яго толькі сем. Падчас выставы яны былі вывешаны ў калідоры бібліятэкі. Супрацоўнікі і наведвальнікі неаднойчы казалі, што быццам адчуваюць пах ладану. І гэта пры тым, што яго там і блізка няма.

Наогул, у доме-інтэрнаце шмат талентаў. Напрыклад, у Маргарыты Казіміраўскай атрымліваюцца выдатныя малюнкі ў стылі графікі. Педагог параіла ёй папрацаваць у тэхніцы «дудлінг», і жанчына захапілася. З-пад яе рукі выходзяць на дзіва цікавыя формы. Яна нават удасканаліла занятак, уплятае ва ўзор беларускі арнамент. Работы атрымліваюцца эксклюзіўныя.

А Аляксандра Касцяна ў доме-інтэрнаце называюць не інакш, як Ляўша. Аляксандр — калясачнік, але ў яго сапраўды залатыя рукі. Ён робіць надзвычай элегантныя рэчы з дрэва. Прычым з вялікай колькасцю мініяцюрных дэталяў, з ювелірнай дакладнасцю. Майстар карыстаецца лупай і пінцэтам.

— З нашымі ўмельцамі працуюць таленавітыя педагогі Алена Мікуліч і Анатоль Літаеў, — удакладняе Алена Сямёнава. — Алена вельмі добра адчувае, у каго да якой творчасці ляжыць сэрца, Анатоль кіруе мужчынскай камандай, якая займаецца вырабамі з дрэва. У нас тут свае музыканты, спевакі, майстры гутарковага жанру. Тая ж Вера Буйноўская і вершы піша, і байкі расказвае. Ёй 84 гады, а яна яшчэ маладым форы дасць. Яна ж удзельніца ансамбля «Сябрына». У нас там два гарманісты ёсць. Без гэтага ансамбля ніводны канцэрт не абыходзіцца. Да нас у госці таксама прыязджаюць розныя творчыя калектывы. Так што ёсць стымул удасканальвацца.

Асобная гаворка пра спартыўныя дасягненні тутэйшых жыхароў. Спартыўная каманда «Раста» — пастаянная ўдзельніца раённых, абласных і нават міжнародных (такіх як «Залаты леў») спаборніцтваў па інваспорце. За мінулы год заваявалі 34 медалі! Ліліі Курс няма роўных па бочэ, а Алена Някрасава спрытна гуляе ў карнхол. Зараз яна асвойвае новую гульню новус, бо, як яе яшчэ называюць, марскі більярд. Гульню падарылі ў якасці прыза за чарговую перамогу. У камандзе ёсць добрыя гульцы ў шашкі. Той жа Мікалай Шаўцоў ніколі не вяртаецца са спаборніцтваў без медаля. Кіруе камандай па інваспорце і натхняе яе на перамогі псіхолаг Ірына Васіна.

А нядаўна па прапанове кіраўніка гуртка па рабоце з драўнінай Анатоля Літаева ўстанова паспрабавала свае сілы ў новай для сябе дзейнасці — пчалярстве. Пазалетась каля дома-інтэрната быў высаджаны сад надзеі — 100 фруктовых дрэў і 150 пладова-ягадных кустоў. З набыццём саджанцаў дапамаглі прафсаюз работнікаў АПК і фермеры. Ідэя з пчалярствам была дарэчы, бо хацелася, каб сад лепш пладаносіў. Летась прадпрымальнік з Дрыбінскага раёна Міхаіл Грашчанка перадаў расцянскім пчалярам чатыры вуллі з сем'ямі. Пчолкі пастараліся і забяспечылі сваіх гаспадароў першым мядком. Гэта натхніла пачаткоўцаў. Пад кіраўніцтвам Анатоля Літаева тут утварылася лячэбна-працоўная майстэрня «Пчаляр», якая аб'ядноўвае шэсць чалавек. Яны старанна выконваюць свае абавязкі. Нават зараз, калі пчолы спяць, двойчы на тыдзень ходзяць правяраць, ці ўсё добра ў пчаліным царстве.

— Мы збіраемся развіваць гэты кірунак, таму летась напісалі праект і размясцілі яго на сайце аблвыканкама, — расказвае дырэктар установы. — Сэнс у тым, што мы хацелі б павялічыць колькасць вулляў і займацца па-сур'ёзнаму. Камітэт па працы, занятасці і сацыяльным абслугоўванні Магілёўскага аблвыканкама нас падтрымлівае. Ён наогул увесь час з намі на сувязі, заўсёды дапамагае, накіроўвае. Нечакана хутка знайшліся і спонсары. Фінансавую падтрымку нам аказала пасольства ФРГ. Мы купілі яшчэ шэсць вулляў і неабходны інвентар. Плюс абсталяванне для зоны адпачынку. Заадно рыхтуем новыя домікі для нашых пчолак. Каштоўна тое, што нашы жыхары пастаянна чымсьці занятыя і адчуваюць сябе патрэбнымі грамадству, бо ствараюць для іншых настрой і прыгажосць.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Алены СЯМЁНАВАЙ.